Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. ПЯТНІЦА №198 (28562)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Хата на хату» з Янкам Крукам

СТАР. 5



Дзівакі зніклі, дурні засталіся?

СТАР. 15



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У нас ёсць асобная ўласная праграма па лічбавізацыі знешняга гандлю. Калі мы яе рэалізуем, гэта дасць плюс 1% да ВУП штогод. Гэта вельмі сур'ёзны эфект. Гэты кірунак неабходна развіваць і на прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза. І тут беларускі бок выступае ініцыятарам. Нам хацелася б, каб мы як мінімум не спазніліся, а лепш за ўсё — апынуліся на піку гэтага руху».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9677 | ▼ |
| Еўра | 2,3325 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0341 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0739 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# «ЗВЯЗДА» КІРУЕЦЦА ДА ЗОРКІ




Сужэнцы Віктар і Вера МОРХАТ з вёскі Зорка Шаркаўшчынскага раёна — верныя падпісчыкі «Звязды» — выпісваюць нашу газету з 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Якія б ні былі перамены ў жыцці, а Віктар Стэфанавіч і Вера Іванаўна ні разу не памянялі свой чытацкі выбар. Гэтак жа як і ў сваёй прафесіі: Віктар Стэфанавіч быў мовазнаўцам і гісторыкам, Вера Іванаўна выкладала фізіку і нямецкую мову, была дырэктарам Зоркаўскай сярэдняй школы. Дарэчы, школа была беларускамоўная, і «Звязда» часта была крыніцай інфармацыі аб правільным ужыванні мовы.

— «Звязда» і Зорка (назва нашай вёскі) — хоць і з'яўляюцца аднолькавымі астранамічнымі сімваламі космасу і далёкіх планет, але для нас у першую чаргу гэтыя назвы даюць адчуванне сваёй радзімы, без іх нельга ўявіць Беларусь, — кажуць нашыя зоркаўскія падпісчыкі.

І з імі нельга не пагадзіцца.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

# «ЦУКЕРКІ», «САЛАДУХА», «ЛЕКСУС» І ІНШЫЯ

**Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на дачы ў аднаго з самых вопытных паўночных вінаградараў Еўропы**



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

**Каля 600 сартоў вінаграду на поўначы краіны за апошнія 35 гадоў высадзіў на дачы пад Віцебскам Віктар КУХАРАЎ. А ў выніку ўласнай селекцыі падарыў свету каля 20 сартоў. Сярод іх: «Белы», «Віцебскі», «Юбілейны Кухарава», «Лексус» (безнасенны), «Шарус», «Саладуха», «Ціхан»... Ён удзельнік дзяржаўнай праграмы «Стварэнне нацыянальнага генетычнага фонду гаспадарча-карысных раслін Рэспублікі Беларусь». Канстатуе, што вырошчваць вінаград прасцей, чым памідоры. Праўда, трэба навучыцца.**

СТАР. 4

■ Нерухомасць

# ЖЫЛЛЁВЫ КВАДРАТ ЯШЧЭ «СХУДНЕЕ»

**Эксперты другаснага рынку нерухомасці ўпэўнены, што сталічныя кватэры да наступнага лета патаннеюць мінімум на 5 працэнтаў.**

**Па выніках верасня колькасць выстаўленых на продаж кватэр паменшылася да мінімальнага за 2017 год узроўню ў 6 700. Аналагічны аб'ём прапановы адзначаўся і ў кастрычніку мінулага года. Але падобны ўзровень, з пункту гледжання суадносін попыту і прапановы, нельга назваць нізкім — ён з'яўляецца нармальным для Мінска. Пасля даволі актыўнага лета ў верасні на 10—15% паменшылася колькасць зарэгістраваных здзелак. А гэты факт ужо дае падставу для разваг наконт таго, што рынак гатовы для далейшага вітка зніжэння цэн. Каб прафесійна ацаніць сітуацыю на мінскім рынку жылля і скласці прагноз на наступныя некалькі месяцаў, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з вядомым экспертам у сферы жыллёвай нерухомасці — старшынёй савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» (БелАН) Мікалаем ПРАСТАЛУПАВЫМ.**

## Попыт на маленькія кватэры

Прыйшла восень — пачала зніжацца і пакупніцкая актыўнасць. У параўнанні з канцом лета, у верасні яна знізілася практычна на 17%. Гэта павінна выступіць нагляднай перасцярогай для тых прадаўцоў кватэр, якія ў зніжэнні кошту крэдытаў убачылі пачатак перыяду росту цэн. Мы адзначаем такія выпадкі па цэнах, якія самастойна выстаўляюцца прадаўцамі пры продажы кватэр. Пры гэтым большасць з іх да гэтага часу працягваюць заставацца ў стане «актыўнага пошуку» новага гаспадара. На практыцы ж цэны рэальных здзелак на працягу ўсяго 2017 года застаюцца прыкладна на адным узроўні — адзначаюцца толькі нязначныя ваганні, абумоўленыя якаснай структурай прададзеных у тым ці іншым месяцы кватэр.

Нягледзячы на значна «патаннеўшыя» за апошні год крэдыты, дагэтуль пераважная частка зарэгістраваных у цяперашні час здзелак уяўляе сабой не куплю з «нуля», а набыццё больш прасторнай кватэры ўзамен наяўнай.

СТАР. 4

# НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ



**У гонар 20-годдзя Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі ў сталіцы прайшла міжнародная канферэнцыя, прысвечаная прымяненню сучасных тэхналогій у лячэнні дзяцей з онка-гематалагічнымі захворваннямі, гемапатыямі, пярвічнымі імунадэфіцытамі. У рабоце секцый і круглых сталоў прымалі ўдзел спецыялісты з Расіі, Украіны, Казахстана, Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Швейцарыі, Ізраіля.**

Аказанне медыцынскай дапамогі і абслугоўвання ў цэнтры сёння на самым высокім узроўні, заўважыла падчас урачыстага прыёму **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА.** Яна таксама падкрэсліла, што ўсе, хто тут працуе, робяць гэта з вялікай любоўю да пацыентаў, асобна выказала словы падзякі дырэктару РНПЦ дзіцячай анкалогіі Вользе Алейнікавай. У віншаванні кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі, агучаным Наталляй Качанавай, гаворыцца, што дзейнасць установы — яркі прыклад няспыннага развіцця навукі і практыкі, што дазволіла ўзняць узровень аказання меддапамогі дзецям з цяжкімі захворваннямі на сусветны ўзровень. Словы падзякі Прэзідэнт адрасаваў усім супрацоўнікам, а таксама тым, хто стаяў каля вытокаў стварэння цэнтра: «Менавіта іх намаганнямі былі дасягнуты першыя значныя поспехі вашага згуртаванага, таленавітага калектыву. Упэўнены, вы і надалей будзеце заставацца прыкладам самаадданага служэння сваёй справе».

Сёння ў цэнтры праводзіцца лячэнне дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў з усімі відамі гематалагічнай і анкалагічнай паталогіі (за выключэннем раку шчытападобнай залозы) і прыроджанымі імунадэфіцытамі, а таксама маладым людзям ва ўзросце 18—29 гадоў з вострым лімфабласным лейкозам. Паколькі лячэнне практычна любых пухлін у дзяцей мае на ўвазе хірургічны этап, то адным з ключавых падраздзяленняў цэнтра можна лічыць выдатна аснашчаны сучасны аперацыйны блок. Апошнім часам хірургічныя ўмяшанні, з аднаго боку, становяцца больш складанымі, а з другога — расце доля малаінвазіўных. З прыцягненнем у некаторых выпадках сасудзістых хірургаў, мікрахірургаў, траўматолагаў-артапедаў РНПЦ «Кардыялогія», Мінскай абласной клінічнай бальніцы, РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі ажыццяўляюцца складаныя ўмяшанні пры пухлінах галавы і шыі, канечнасцяў, скуры, мяккіх тканак. Расце доля малатраўматычных аперацый на грудной клетцы і брушной поласці. Выконваецца эндапратэзаванне касцей і суставаў. Усяго ў цэнтры праводзіцца каля 1000 аперацый у год, больш за палову якіх — складаныя паласныя, прыкладна кожная чацвёртая — высокатэхналагічная.

Дзякуючы сваёй практычнай і навуковай дзейнасці, цэнтр сёння вядомы далёка за межамі краіны. Варта нагадаць, што 25 гадоў таму ў Беларусі вылечвалі ад раку каля 15 працэнтаў дзяцей, а сёння размова ідзе пра 75 працэнтаў. Дарэчы, у дзяцей рак больш агрэсіўны, больш цяжкі і, разам з тым, клеткі дзіцячага арганізма больш адчувальныя да хіміятэрапіі, іх прасцей забіць. Дзесьці кожны дзясяты пацыент — замежнік, які прыехаў з краіны, дзе няма такой высокатэхналагічнай дапамогі. Гэта датычыцца найперш трансплантацыі касцявога мозгу.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

*protas@zviazda.by*

■ Напярэдадні

# СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ...

## Дэлегаты XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў рыхтуюцца прадставіць нашу краіну

**Не згубіцца на міжнароднай пляцоўцы, падкрэсліць сваю нацыянальную ідэнтычнасць і не забыцца пра Еўрагульні-2019. Такія задачы сёння стаяць перад беларускімі дэлегатамі XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, які стартуе ў Сочы ўжо ў канцы гэтага тыдня.**

Над тым, як прадставіць Беларусь на маштабнай выставе, што пройдзе падчас мерапрыемства, працуюць вядучыя маладзёжныя арганізацыі краіны. Па плане арганізатараў усе ахвотныя не проста павінны пазнаёміцца з шматвяковай культурай, турыстычным і эканамічным патэнцыялам Беларусі, але і атрымаць станоўчыя эмоцыі ад пастаяннага інтэрактыву.

Як расказаў **старшыня Маладзёжнага савета Федэрацыі прафсаюзаў Арцём ІГНАЦЕНКА**, на нацыянальнай выставе, якая будзе працаваць у працэсе фестывалю, удзельнікі пастараюцца раскрыць нашу краіну максімальна і шматвектарна. «У рамках нашых праектаў будзе прадстаўлена «Беларусь у мініяцюры». На цэнтральнай выставачнай стойцы будуць дэманстравацца мініяцюры Мірскага, Нясвіжскага замкаў, Нацыянальнай бібліятэкі. Кожны ахвотны зможа сабраць мадэлі ўсіх гэтых аб'ектаў. Праект «Беларусь замкавая» дазволіць кожнаму ўдзельніку «прайсціся» па нашых замках з дапамогай акуляраў віртуальнай рэальнасці. Запланавана і зона беларускай гасціннасці, дзе ўсе ахвотныя змогуць прадэгуставаць прадукты нашай краіны. Акрамя таго, мы правядзём віктарыну «Пазнаем Беларусь разам», — распавёў Арцём Ігнаценка.

У сваю чаргу **кансультант Цэнтральнага савета Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Рыта АРЦЁМАВА** паведаміла, што беларускія піянеры прадставяць на фестывалі ў Сочы піянерскі талісман. Маленькае зубраня — мяккая цацка, з нацыянальным каларытам. «Кожны ахвотны зможа прышыць да цацкі кавалак з тасьмы з выявай эмблемы піянерскай арганізацыі і пакінуць сабе гэты сувенір на памяць», — расказала Рыта Арцёмава.

XIX Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў пройдзе з 14 па 22 кастрычніка ў Сочы. Мерапрыемства абяцае сабраць больш за 20 тысяч удзельнікаў са 150 краін свету.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

*kryzhevich@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Прэм'ер Іспаніі даў Каталоніі на тлумачэнні тэрмін да 16 кастрычніка

Кіраўнік Каталоніі Карлес Пучдэмон павінен да 16 кастрычніка растлумачыць, што азначае дэкларацыя незалежнасці, падпісаная ў аўторак увечары рэгіянальнымі уладамі. Пра гэта заявіў у Кангрэсе дэпутатаў (ніжняя палата парламента) старшыня ўрада Іспаніі Марыяна Рахой. «Ён (Пучдэмон) павінен адказаць на працягу тэрміну, які заканчваецца ў панядзелак (16 кастрычніка) у 10.00 па мясцовым часе (11.00 — па мінскім), — адзначыў прэм'ер. — Калі будзе станоўчы адказ ці не будзе адказу, Пучдэмон павінен будзе загадаць адмяніць дадзеную дэкларацыю незалежнасці». На гэта ўладам Каталоніі адводзіцца тэрмін да 19 кастрычніка. Пучдэмон напісаў у сваім твітары: «Мы імкнёмся да дыялогу, а яны пагражаюць нам артыкулам 155. Усё тут ясна».

## У В'етнаме ахвярамі паводкі сталі каля 50 чалавек

Больш чым 20 чалавек прапалі без вестак, паведамляе мясцовая газета VnExpress. У некаторых раёнах ліўні выклікалі сходы апоўзняў. Улады паўночнай правінцыі Хоабінь абвясцілі надзвычайнае становішча ў сувязі са стыхіяй. Больш за 5 тысяч сем'яў у цэнтральных правінцыях Тханьхоа, Нгеан і Хацінь вымушаныя былі пакінуць свае дамы. Улады працягваюць эвакуацыю мясцовых жыхароў, якія пражываюць у пацярпелых ад стыхіі раёнах. Па звестках выдання, летась трапічныя штормы і паводкі нанеслі В'етнаму шкоду ў памеры 1,75 мільярда долараў. Загінулі 264 чалавекі.

## Польскія ўлады выплацяць кампенсацыі за экспрапрыяваную камуністамі ўласнасць

Польшча мае намер пакрыць шкоду ўласнікам, нерухомасць якіх была экспрапрыяваная камуністычнай уладай краіны пасля Другой сусветнай вайны. Адпаведны законапраект, прадстаўлены напярэдадні намеснікам міністра юстыцыі Польшчы Патрыкам Якій, мяркуе пакрыццё 20% ад кошту нацыяналізаванай маёмасці. Першыя кампенсацыі будуць выплачаныя ў 2019 годзе, паведамляе выданне Wyborcza.pl. Агульны кошт экспрапрыяванай у Польшчы маёмасці, па дадзеных Асацыяцыі былых уласнікаў, ацэньваецца прыкладна ў 15 млрд еўра, пагашэнне страт можа заняць, як заявіў Патрык Якій, «доўгія гады».

## Капітал найбагацейшага жыхара Кітая ацанілі ў $43 млрд



Спіс найбагацейшых жыхароў Кітая, па інфармацыі даследчай арганізацыі «Хужунь», узначаліў кіраўнік адной з найбуйнейшых кампаній-забудоўшчыкаў у краіне China Evergrande Group Сюй Цзяінь. На другім месцы ў рэйтынгу размясціўся заснавальнік тэлекамунікацыйнай кампаніі Tencent Поні Ма: яго маёмасць складае 37 мільярдаў долараў, што на 52% больш, чым годам раней. Заснавальнік найбуйнейшай кітайскай інтэрнэт-кампаніі Alibaba Group Джэк Ма сёлета не ўтрымаў другое месца і апынуўся на трэцяй пазіцыі. За апошні год яго капітал скараціўся на 2%. Паводле звестак «Хужунь», цяпер на тэрыторыі мацерыковага Кітая пражываюць 647 мільярдэраў, што на 53 больш, чым летась.


РРБ современный европейский банк

**Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития»**

220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18

**www.rrb.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2017 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2017 | 01.01.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3 404 | 5 193 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | – | – |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 13 285 | 4 646 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 2 789 | 10 746 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 23 334 | 72 987 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 82 532 | 57 333 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | – | 7 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | – | – |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 27 722 | 27 206 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 1 229 | 98 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 12 | 12 |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 2 296 | 2 615 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 156 603 | 180 843 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | – | – |
| 17 | Средства банков | 1202 | 7 370 | 12 076 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 106 062 | 124 833 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | – | 3 125 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | – | – |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | – | – |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 619 | 908 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 114 051 | 140 942 |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 20 429 | 20 429 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 1 174 | 981 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 6 892 | 6 835 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 14 057 | 11 656 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 42 552 | 39 901 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 156 603 | 180 843 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2017 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2017 | 01.10.2016 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 11 557 | 15 819 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 5 842 | 10 127 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 5 715 | 5 692 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 264 | 2 225 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 595 | 556 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 669 | 1 669 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | – | – |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (218) | (40) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 541 | 1 334 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 124 | (13) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 533 | (1 640) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 617 | 2 293 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7 087 | 8 876 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 293 | 242 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 2 535 | 3 457 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 77 | 326 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 2 458 | 3 131 |

Председатель Правления Дранкевич В. В.

Главный бухгалтер Карчмит Т. И.

Дата подписания 04 октября 2017 г. УНП 100361187



## УВЕДОМЛЕНИЕ О ПЕРЕДАЧЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВ

Закрытое акционерное страховое общество «Аснова страхование» на основании пункта 26 Положения о страховой деятельности в Республике Беларусь, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь 25.08.2006 года №530 «О страховой деятельности», в связи с прекращением деятельности (ликвидацией в добровольном порядке) уведомляет о передаче обязательств ЗАСО «Аснова страхование» по договорам добровольного страхования страховой организации ЗАСО «Белнефтестрах».

По всем возникающим вопросам обращаться по телефонам: +375 (17) 2004556, +375 (17) 3060113, +375 (17) 2048775. Адрес сайта www.asnovains.by.

УНП 80600245



## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского–пр. Любимова–ул. Семашко (2-я очередь строительства). Жилой дом №16 по генплану», опубликованной в газете «Звязда» №193 (28557) от 06.10.2017**

.....«Получены разрешения Госстройнадзора №2-203Ж-055/16 от 15.12.2016, от 26.01.2017, от 19.07.2017, от 06.10.2017».

УНП 192400611


**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Русаку Віктару Рамуальдавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

## Нашы ўзнагароды

# «ЗВЯЗДА» АТРЫМАЛА ДЫПЛОМ ЗА «СЯМЕЙНУЮ ГАЗЕТУ»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У творчай скарбонцы ўзнагарод нашай газеты — папаўненне. Учора тэматычны дадатак «Сямейная газета» атрымаў дыплом Міністэрства інфармацыі «за ўсебаковае і высокапрафесійнае асвятленне сямейнай тэматыкі» ў межах конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава»:**

— Мне прыемна сведчыць пра тое, што ў рэспубліканскім творчым конкурсе «Моцная сям'я — моцная дзяржава», які традыцыйна праводзяць Міністэрства інфармацыі і Беларускі саюз жанчын, удзельнічаюць усё болей і болей журналістаў, — адзначыў **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Сёлета мы атрымалі амаль 80 работ больш чым ад 70 сродкаў масавай інфармацыі, як рэспубліканскіх, так і рэгіянальных. Прычым, што радуе, публікацыі і выступленні ў эфіры прадстаўлены ва ўсёй палітры журналісцкіх жанраў.

Перад узнагароджваннем пераможцаў конкурсу прайшоў круглы стол на тэму «Аб павышэнні ролі СМІ ў рашэнні актуальных пытанняў паляпшэння здароўя жанчын, умацавання сямейных каштоўнасцяў, прапагандзе здаровага ладу жыцця». У межах дыскусіі былі ўзняты глыбокія пытанні. Шмат гаварылі не толькі пра фізічнае здароўе бацькоў і іх дзяцей, але і пра духоўнае. Таксама выступоўцы, сярод якіх дэпутаты, педагогі, медыкі, работнікі цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей, святары, закранулі шмат праблемных момантаў. У прыватнасці, што наспела неабходнасць стварэння «бацькоўскіх універсітэтаў» і ўвядзення ўрокаў «Псіхалогія сямейных адносінаў» у школах. Пры гэтым адзначылі, што існуе вострая патрэба ў высокакваліфікаваных крызісных і сямейных псіхолагах. Выказалі заклапочанасць такімі з'явамі сучаснасці, як сужыхарства і «чайлдфры» (калі маладыя сем'і не жадаюць мець дзяцей). Паколькі набліжаецца Дзень маці, то ў цэнтры ўвагі, вядома, была жанчына. У прыватнасці, удзельнікі дыскусіі разважалі, якой павінна быць сям'я, каб жанчына была шчаслівай. І, што цікава, урэшце вывелі формулу жаночага шчасця (падрабязней пра гэта і не толькі чытайце ў найбліжэйшым нумары «Сямейнай газеты»).

Разам з тым усе выступоўцы падкрэслілі важную ролю сродкаў масавай інфармацыі ў папулярызацыі сямейных каштоўнасцяў.

— Сёння сфарміравана велізарнае праблемна-тэматычнае поле для будучых выступленняў журналістаў на старонках газет і часопісаў, у тэлерадыёэфіры, у сацыяльных сетках, — рэзюмаваў Аляксандр Карлюкевіч. — Тыя тэмы і прыклады, якія агучылі падчас круглага стала, сведчаць пра зацікаўленасць грамадства ў развіцці інстытута сям'і.

Міністр інфармацыі лічыць важным, каб СМІ і далей актыўна асвятлялі сямейную тэматыку, працягвалі гадаваць парасткі дабра, маральнасці і духоўнасці ў бацькаў і іх дзецях.

**Надзея ДРЫЛА.**
*nadzieja@zviazda.by*

## Першае месца

# РАБОТАЙ ЗАБЯСПЕЧЫЛІ

### 1200 студэнтаў-платнікаў размеркавалі сёлета па іх жаданні

**Сёлета ва ўніверсітэтах быў двайны выпуск — на IT-спецыяльнасцях, гуманітарных, педагагічных, прыродазнаўчанавуковых. У выніку размеркаваны 24,3 тысячы студэнтаў ВНУ, якія вучыліся на бюджэце (без уліку ўстаноў адукацыі МУС, МНС, Міністэрства абароны і Дзяржпагранкамітэта). Гэта на 7,4 тысячы больш, чым летась.**

— Сітуацыя на рынку працы характарызавалася зніжэннем попыту на спецыялістаў і ростам канкурэнцыі паміж прэтэндэнтамі на вакансіі. Пры гэтым паказчыкі размеркавання значна палепшыліся ў параўнанні з мінулым годам. Па аператыўных звестках, сёлета першае працоўнае месца атрымалі 98,9 працэнта выпускнікоў, якія вучыліся за кошт бюджэтных сродкаў. У 2016-м такіх было 96 працэнтаў, — агучыла лічбы **кансультант галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Вольга МУШЧЫНСКАЯ.**

Дадаткова былі размеркаваны 1200 платнікаў, які выказалі такое жаданне. Права на самастойнае працаўладкаванне атрымала нязначная колькасць студэнтаў. У асноўным з-за таго, што ім не маглі падабраць работу ў сувязі з сямейна-бытавымі ўмовамі (напрыклад, па месцы жыхарства мужа або жонкі ці бацькоў-інвалідаў не было адпаведных вакансій).

Што да ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, то там было размеркавана 99,5 працэнта выпускнікоў з ліку бюджэтнікаў (усяго сёлета каледжы і ліцэі падрыхтавалі больш за 45 тысяч рабочых і спецыялістаў). Свабодны дыплом атрымалі толькі 204 чалавекі.

Па інфармацыі Мінадукацыі, штогод да першага працоўнага месца не даязджае 5—6 працэнтаў «размеркаванцаў». Кажуць, што прычыны ў асноўным уважлівыя — прызыў у армію ці паступленне ў магістратуру.

Па словах Вольгі Мушчынскай, у новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі будзе разглядацца пытанне аб удасканаленні сістэмы размеркавання. Але размовы пра адмену не ідзе. «Мы працуем у інтарэсах наймальнікаў. Калі б мясцовыя органы выказаліся за адмену размеркавання, тады іншая справа. Але пакуль падобных заяў не паступала».

**Начальнік упраўлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі Міністэрства аховы здароўя Вольга МАРШАЛКА** расказала пра сітуацыю ў сваёй галіне. Сёлета медуніверсітэты падрыхтавалі тры тысячы спецыялістаў.

— Мы працуем пад бягучую і перспектыўную кадравую патрэбу. Каля 70 працэнтаў выпускнікоў былі размеркаваны ў сельскую мясцовасць і пярвічнае звяно. Заробкі маладых спецыялістаў у вёсках, дарэчы, вышэйшыя, чым у горадзе, — адзначыла прадстаўнік ведамства.

Над тым, каб юныя ўрачы заставаліся на месцах і пасля заканчэння размеркавання, міністэрства працуе разам з мясцовымі выканаўчымі ўладамі. Перш за ўсё вырашаюць пытанне пражывання. Таксама праводзяць анкетаванне моладзі, каб высветліць найбольш актуальныя для іх моманты і ўбачыць рэгіёны, якія не спраўляюцца з сітуацыяй.

Вольга Маршалка заўважыла, што ў цэлым працэнт спецыялістаў, якія сыходзяць з галіны, змяншаецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## Год навукі

# КУДЫ РУХАЕЦЦА «ГРАМАДСТВА РЫЗЫКІ»?

**Першы беларускі філасофскі кангрэс «Нацыянальная філасофія ў глабальным свеце» пройдзе з 18 па 20 кастрычніка з удзелам прадстаўнікоў 20 краін. Па маштабнасці з гэтым мерапрыемствам зможа сапернічаць толькі II з'езд беларускіх вучоных, правядзенне якога запланавана на снежань.**

Па словах **дырэктара Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Анатоля ЛАЗАРЭВІЧА,** першапачаткова кангрэс планаваўся як падзея рэспубліканскага маштабу, але хутка стала зразумела, што да гэтага форуму ёсць вялікі міжнародны інтарэс. Арганізатары атрымалі 800 заявак ад ахвотных да яго далучыцца, але, улічваючы ўмяшчальнасць вялікай залы Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, змаглі задаволіць з іх толькі 500. Яшчэ 200 чалавек будуць удзельнічаць завочна, даслаўшы на кангрэс свае стэндавыя даклады.

Прыкладна палова ўдзельнікаў — гэта прадстаўнікі айчыннай навукі: беларускія філосафы, палітолагі, культуролагі, сацыёлагі. Астатнія — прадстаўнікі філасофскай эліты з краін блізкага і далёкага замежжа.

Падчас кангрэса 19 кастрычніка будзе адкрыты Беларуска-кітайскі даследчы цэнтр філасофіі і культуры пры Нацыянальнай акадэміі навук. «Ён будзе спрыяць інтэнсіфікацыі кантактаў паміж нашымі навуковымі ўстановамі, а таксама будаўніцтву Эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Традыцыйна ў першую чаргу пад увагу бярэцца эканамічны складнік, але мы перакананыя, што цудоўная ідэя будзе прабуксоўваць, пакуль мы не падключым патэнцыял гуманітарнай навукі», — падкрэсліе Анатоль Лазарэвіч.

Прыедзе ў Мінск з Італіі Генеральны сакратар Міжнароднай федэрацыі філасофскіх таварыстваў прафесар Скаранціна — ключавая фігура ў філасофскай навуцы, арганізатар сусветных філасофскіх форумаў.

Кангрэс будзе праходзіць адначасова на трох буйных пляцоўках: у Нацыянальнай акадэміі навук (інстытутах філасофіі, гісторыі і Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН), у Беларускім дзяржаўным універсітэце і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

— У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў філасофскага кангрэса апынуцца праблемы сучаснага тэхнагеннага грамадства, новых тэхналогій, праблема выбару паміж натуральным і штучным інтэлектам, паміж чалавекам і робатам, — паведаміў Анатоль Лазарэвіч. — Мы жывём цяпер у іншай сістэме каштоўнасцей і каардынат. Сучаснае грамадства называюць грамадствам на рызыкі, таму што незразумела, па якой канфігурацыі яно развіваецца. Адзін з прадстаўленых на кангрэсе дакладаў якраз будзе называцца «Куды рухаецца сучасная цывілізацыя?». Яго аўтар, выкарыстоўваючы матэматычнае мадэляванне, агучыць розныя магчымыя варыянты і стратэгіі развіцця чалавецтва...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**АКТУАЛЬНЫ ТЭЛЕФОН**

**Традыцыйныя прамыя лініі адбудуцца ў суботу, 14 кастрычніка, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 праўдзяць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Віктар Яўгенавіч САКОЎСКІ. Тэл. 8-016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Віктар Віталевіч АСКЕРКА. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8-023 275 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8-015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА. Тэл. 8-022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Іван Эдуардавіч ЛІПНІЦКІ. Тэл. 8-017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК. Тэл. 8-017 222 44 44.

## Надвор'е

# МОЦНЫ ВЕЦЕР І СЫРА

### А на наступным тыдні — да плюс 18

**Дажджлівя і ветрана будзе ў нашай краіне ў выхадныя, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Атлантычныя цыклоны, што рухаюцца на поўначы ад нашай краіны, прынеслі дажджы і парывісты вецер. Месцамі ўжо дасягнута месячная норма ападкаў.

Захаваецца моцны парывісты вецер і ў суботу. Не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 цяпла, удзень — ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 13—15 цяпла.

На большай частцы тэрыторыі чакаюцца дажджы і ўначы ў нядзелю. А ўдзень вільгаці будзе менш і выгляне сонца, але часам не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў і парывістага ветру. Уначы — 7—12 цяпла, па паўночным усходзе — каля плюс 5 градусаў. Удзень — ад плюс 10 да плюс 15 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — да 17 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, і ў панядзелак у некаторых раёнах, пераважна па паўночным усходзе, пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—9 цяпла, удзень — ад плюс 9 да плюс 15 градусаў. У паўднёва-заходніх раёнах уначы будзе цяплей, тэмпература паветра чакаецца ад плюс 10 да плюс 12 градусаў. Удзень тут будзе ўвогуле камфортна — да плюс 16—18 цяпла. У аўторак у некаторых раёнах, пераважна па паўночным усходзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ізноў чакаецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 цяпла, а ўдзень — плюс 10—16 градусаў, а па поўдні ўвогуле да 17—18 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## На слыху

# ПРАЗ ГОД УЗЯЎСЯ ЗА НОЖ

### Пасля бензапілы і сякеры...

**Уладзіслаў Казакевіч напаў на кантралёраў у шклоўскай калоніі, паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў.**

У папраўчай калоніі №17 Шклова 12 кастрычніка каля 10.40 пры вывадзе асуджанага Уладзіслава Казакевіча на прагулку падчас правядзення стандартнай працэдуры нагляду спрацаваў металадэтэктар у вобласці яго левага рукава. Асуджанаму было прапанавана здаць забаронены прадмет, але ён, не выканаўшы патрабаванні вайсковага нарада, правай рукой выхапіў з рукава самаробны нож і паспрабаваў напасці на супрацоўніка адміністрацыі калоніі. Дзякуючы прафесійным дзеянням начальніка вайсковага нарада кантралёраў і асабовага саставу нарада асуджаны Уладзіслаў Казакевіч быў абяззброены. У цяперашні час на месцы здарэння працуе следча-аператыўная група.

Нагадаем, сёлета ў сакавіку Мінскі гарадскі суд прызнаў 18-гадовага студэнта першага курса Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» Уладзіслава Казакевіча вінаватым у забойстве супрацоўніцы ГЦ «Новая Еўропа», у замаху на забойства і злосным хуліганстве, здзейсненым летась 8 кастрычніка ў Мінску, і прысудзіў яго да 15 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму.

# ПАД СУД ЗА ЗАБОЙСТВА КАЦЯНЯЦІ

**У сталіцы ў судзе Першамайскага раёна пачаўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да мінчаніна, які абвінавачваецца ў жорсткім абыходжанні з жывёлай, што прывяло да яе гібелі.**

Здарэнне адбылося каля пад'езда аднаго з дамоў па вуліцы Русіянава. На вачах мінакоў мужчына ўзяў маленькае кацяня і некалькі разоў ударыў яго галавой аб сцяну. Ад атрыманых траўм жывёла памерла на месцы. Сведкі гэтага дзікунства паведамілі ў міліцыю, нават прадаставілі здымкі з мабільнага тэлефона, якія паспеў зрабіць адзін з іх. Мінчанін матываў сваёй учынку назваў тое, што кацяня выклікала раздражненне, бо пражывала ў жанчыны, з якой ён якраз перад сваёй выхадкай распіваў алкаголь, — мужчына быў нападпітку. Цяпер яму пагражаюць грамадскія работы ці штраф, ці папраўчыя работы на тэрмін да аднаго года або арышт.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ЖЫЛЛЁВЫ КВАДРАТ ЯШЧЭ «СХУДНЕЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым «пашырэнне» адбываецца не толькі па прынцыпе «плюс адзін» пакой — нярэдкія выпадкі пашырэння з адна- або двухпакаёвых кватэр адразу на трох- ці чатырохпакаёвыя.

У сітуацыях «замены» кватэры на больш прасторную асноўная складанасць з'яўляецца ў аб'яднанні працэсаў продажу і набыцця кватэры ў адзіны механізм. Справа ў тым, што сямейныя пакупнікі не могуць сабе дазволіць выехаць з прададзенай кватэры і пасля гэтага павольна шукаць новае жыллё. Людзі імкнуцца заехаць у новую жыллпошчу прама са старой, бо яны, як правіла, забіраюць з сабой наяўную мэблю, бытавую тэхніку, ды і дзяцей не хочацца далёка вазіць у садок і школу.

Асноўны аб'ём пакупніцкага попыту сканцэнтраваны на адна- і двухпакаёвых кватэрах. На іх долю прыпадае больш за 80% заявак на куплю кватэр, пры гэтым з невялікім адрывам лідзіруюць аднапакаёвыя. Трохпакаёвыя кватэры цікавяць пакупнікоў значна менш — толькі 16% запытаў. А на кватэры з чатырма і больш пакоямі ўвогуле патрэбен асаблівы пакупнік — зараз далёка нямногім пад сілу не толькі купіць падобную кватэру, але і пасля ўтрымліваць яе. Таму падобнымі прапановамі цікавіцца толькі каля 4% патэнцыйных пакупнікоў.



## Цэны вагаюцца

Як і на працягу года, гэтай восенню пераважная частка пакупнікоў набывае кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў якія патрабуюць правядзення як мінімум касметычнага рамонту.

Далей мы прапануем цэны рэалізацыі стандартных сталічных кватэр за верасень. У залежнасці ад якасці жылля існуе мінімальная і сярэдняя цана на яго. Напрыклад, мінімальная цана квадратнага метра аднапакаёвай кватэры пачынаецца з 850 долараў, двухпакаёвай — з 825 долараў, а трохпакаёвай — з 815 долараў. Мінімальны кошт аднапакаёвай кватэры (маласямейкі) стартуе з 28 тысяч долараў. Двухпакаёўка ў такім фармаце на мінімуме каштуе ў сярэднім 38 тысяч долараў, а трохпакаёвая кватэра — 43 тысячы долараў.

Сярэдняя цана стандартнага па якасці жылля пачынаецца з 1100 долараў за квадратны метр аднапакаёвай кватэры, двухпакаёўкі — з 995 долараў, трохпакаёўкі — з 970 долараў. Сярэдні кошт аднапакаёвай кватэры ўжо пачынаецца з 41 тысячы долараў, двухпакаёўка каштуе 49 тысяч долараў, а трохпакаёвае жыллё — 64 тысячы долараў.

Разам з тым сёння ў продажы і кватэры, гатовыя да пражывання. Гэта жыллё прадаецца з якасным рамонтам, мэбляй, а ў некаторых выпадках і з бытавой тэхнікай. Такія жылыя памяшканні таксама карыстаюцца стабільным попытам. Іх выбірае каля трацііны пакупнікоў.

— Гатовыя да пражывання кватэры — гэта не элітныя, а проста са свежым сучасным рамонтам і мэбляй кватэры, якія дазваляюць новым уласнікам пры ўездзе не думаць аб давядзенні жылля да ладу, а адразу пачынаць жыць з камфортам, — тлумачыць **намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Святлана КУДЗЕЛКА.** — Падобныя кватэры могуць размяшчацца ў любым раёне горада, і тэарэтычна ў любым доме — няхай гэта будзе проста «панэлька» або новабудоўля. Але ўсё ж яны найбольш цікавыя пакупнікам, калі размяшчаюцца ў свежых дамах — маладзейшых за 2009 год пабудовы. У гэтым выпадку пакупнікоў прыцягваюць больш цікавыя планіроўкі і лепшы стан месцаў агульнага карыстання. Акрамя таго, часцяком у маладых дамах кватэры больш прасторныя, чым у «панэльках» 90-х гадоў.

Цэны гатовых да пражывання кватэр таксама адрозніваюцца суадносна з якасцю рамонту і напаўнення. Мінімальная цана квадратнага метра такіх цалкам падрыхтаваных апартаментаў складае 1050 долараў для аднапаёвак, для двухпакаёвак — 950 долараў, для трохпакаёвак — 850 долараў. Мінімальны кошт аднапакаёвай кватэры будзе 34,8 тысячы долараў, двухпакаёвай — 50 тысяч долараў, трохпакаёвай — 58 тысяч долараў. Сярэдняя цана гатовых аднапакаёвых кватэр пачынаецца з 48 тысяч долараў, двухпакаёвак — з 72 тысяч, а трохпакаёвых кватэр — з 81 тысячы долараў.

Асобным радком у прапанове запісаны асобныя пакоі ў шматпакаёвых кватэрах. Такое жыллё карыстаецца невялікім, але стабільным попытам. Цэны на яго вагаюцца яшчэ мацней — ад 10 да 20 тысяч долараў.

## Сучасная прапанова

Па стане на пачатак кастрычніка, больш за ўсё ў Мінску прапануецца на продаж двух- і трохпакаёвых кватэр — каля 2 300 і 2 200 кватэр адпаведна. Аднапакаёвых кватэр крыху менш — каля 1 700 кватэр. Істотна менш кватэр з чатырма і больш пакоямі — каля 740, але на падобныя кватэры і адпаведны невысокі попыт.

Перш чым спыніць выбар на канкрэтнай кватэры, пакупнікі, як правіла, разглядаюць 5—7 варыянтаў. Пры гэтым колькасць прагледжаных кватэр залежыць не ад колькасці пакояў у кватэры, а хутчэй ад патрабаванняў пакупніка. Але ў любым выпадку нават самыя патрабавальныя пакупнікі, як правіла, знаходзяць тое, што шукалі, ужо на шостым праглядзе. Менавіта таму, нягледзячы на высокую актыўнасць пакупнікоў, так важна, выстаўляючы кватэру на продаж, ставіць аб'ектыўную цану, не кажучы ўжо пра недапушчальнасць яе завышэння. Бо пакупнікі фарміруюць спіс кватэр для прагляду, зыходзячы ў першую чаргу з цаны. І ў большасці выпадкаў «перааацэненыя» прадаўцамі кватэры застаюцца без увагі ў канцы гэтага спісу, з-за чаго надоўга "завісаюць" у продажы.

## Адзін, максімум два працэнты

Мабыць, самае цікавае, аб чым пытаемся ў спецыялістаў, — прагнозы, далёкія і не вельмі. Дык вось, Мікалай Прасталупаў лічыць, што да новага года засталося няшмат, а таму патаннець жыллё істотна не паспее — не больш чым на 2%. Гэта патанненне можна нават сур'ёзна не ўлічваць. Больш цікава, а што будзе далей? Наш эксперт упэўнены, што і налета будзе працягвацца невялікае патанненне. А да лета зніжэнне якраз і дасягне 5 працэнтаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# «ЦУКЕРКІ», «САЛАДУХА», «ЛЕКСУС» І ІНШЫЯ

## НЕ БАЯЦЦА МОЦНЫХ МАРАЗОЎ

Бадай, першы раз мы паехалі ў камандзіроўку, каб задаць пытанні і ад калег-дачнікаў. Віктар Паўлавіч супакоіў і ўспомніў, як сам калісьці не верыў, што зможа стаць вінаградарам. Пачаў у 1982 годзе. Ён — далёкі ад біялогіі чалавек. У свой час скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута імя П. М. Машэрава (цяпер — універсітэт).

— Мой таварыш Дзмітрый Токараў, які ўзначальваў секцыю вінаградарства пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце, запрасіў у госці. Падказаў, з чаго распачаць. Потым лёс звёў мяне з самым вядомым у былым СССР спецыялістам Іванам Аляксандравічам Кастрыкіным. Ён двойчы лаўрэат расійскай Дзяржаўнай прэміі, заслужаны аграном, працаваў у лабараторыі селекцыі Усерасійскага НДІ вінаградарства. Усе, хто вырошчваюць вінаград сямейства «Захапленне», завочна ведаюць яго. Дарэчы, назву прыдумалі балгары, якіх уразіў новы сорт, — расказвае вінаградар.

На сваіх пяці сотках у Віцебскім раёне ён вырашыў займацца і вінаградарствам. Жонка спачатку ставілася з недаверам да яго ідэі. Потым сама ўцягнулася.

Навічкам Віктар Кухараў раіць высадзіць сорт «Алёшанкін». Ён непатрабавальны, як і «Агат Данскі». Тым, хто рэдка бывае на дачы, лепш падыдуць прыбалтыйскія сарты. Напрыклад, «Юадупэ» (у перакладзе «Чорная рака»), самы ранні з прыбалтыйскіх. Ягады можна есці ў канцы ліпеня — пачатку жніўня.


Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

А марозаўстойлівасць пладовай пупышкі да -27 градусаў.

— Наогул, вінаград у нашых шыротах не баіцца вялікіх халадоў. А вось так званыя паўторныя замаразкі вясной — насамрэч праблема... Восенню ўсё абразаю і пладовыя атожылкі кладу гарызантальна. На зіму накрываю асакой або чаротам, бо яны не прэюць і не злежваюцца. Потым накідваю плёнку па дажынкі, прыціскаю. І ў тарцах, як па трубе, гуляе паветра... Вясной, калі тае снег, плёнку прыўздымаю, каб туды святло пранікала. І пад хованкай вінаград развіваецца. Галоўнае ўпэўніцца, што можна «абарону» адкрываць, каб пад замаразкі не патрапіць. У нас сёлета нават у канцы чэрвеня былі замаразкі, — тлумачыць эксперт.

Добрыя парады Віктара Паўлавіча можна прачытаць на яго персанальнай старонцы на сайце vinograd.by. Ён таксама аўтар кнігі «Паўночны вінаград. Усе колеры вясёлкі».

Паспрабуйце стаць вінаградарам, раіць Віктар Кухараў: выбар сартоў для нашых шырот вялікі. А з вопытам можна будзе высаджваць і больш патрабавальныя, але і больш смачныя вінаград, такі як «Цукеркі» і іншы.

## 5 СОТАК ДАСТАТКОВА ДЛЯ ПРОДАЖУ

Па саджанцы і парады да яго прыязджаюць не толькі з усёй Беларусі. Латвійцаў ён кансультаваў як масава вырошчваць вінаград.

У самога Віктара Кухарава няма плантацыі для масавага продажу. Яму цікава займацца селекцыяй, апрабоўваць новыя сарты. Саджанцы прадае на кірмашах, у прыватнасці бывае на абласных «Дажынках».

— І вяскоўцы, і дачнікі ў Беларусі могуць атрымаць прыбытак ад вырошчвання вінаграду, — не сумняваецца наш суразмоўнік. — Для гэтага трэба высадзіць 20—30 кустоў аднаго сорту. Напрыклад, «Суперэкстра», «Ронда» (адпаведна расійскі і нямецкі сарты). Пяць сотак для пачатку хопіць. Важна, каб участак атрымліваў максімум святла і сонца. У ідэале лепш паўднёвыя, паўднёва-ўсходнія схілы. Рады папярок схілу — з поўдня на поўнач — дазволяць сонечным прамяням раўнамерна асвятляць кожны куст. Зямля павінна быць... вельмі бедная. Вялікая вільготнасць — таксама дрэнна. Калі глеба глiністая, ямы і траншэі капаць не трэба. Акрамя попелу спачатку ніякіх падкормак. Пры пасадцы толькі раз трэба паліць. Потым расліна сама будзе паспяхова здабываць ваду з ціскам да дзвюх атмасфер. Корань з глыбіні каля сямі метраў можа паставляць ваду. І гэтага хопіць для лазы, калі б яна была даўжынёй каля 100 метраў.

Вінаградны куст, як правіла, дае добрыя ўраджаі да 25—45 гадоў. Дарэчы, у Беларусі, прычым на яе поўначы, ужо вырошчваюць вінаград на продаж. У Аршанскім раёне гэтым займаецца індывідуальны прадпрымальнік. Пад Віцебскам у гаспадарцы «Альгоўскае» таксама не першы год высаджваюць вінаград. Некалькі гадоў таму энтузіястаў вельмі падтрымаў старшыня аблвыканкама.

Дарэчы, айчынны вінаград не патрабуе вялікіх выдаткаў на транспарціроўку, а з-за таго, што яму бліжэй да прылаўка, ён лепш захоўвае смак і вітаміны, чым імпартны. Віктар Кухараў шчыра радуецца, што ўсё больш землякоў захапляюцца вінаградарствам. Аднак айчынная прамысловасць пакуль што не асабліва цікавіцца магчымасцямі і патэнцыялам тых, хто вырошчвае вінаград.

## ПРА ВІНО І... ЧАЧУ

А якое смачнае віно ў спадара Кухарава! Каб зрабіць яго, спачатку трэба здрабніць і падушыць спелы вінаград у ёмістасці. І хай стаіць, пакуль не пачне трохі брадзіць. Трэба, каб лёгка аддаваў сок. Потым трэба адціснуць. Пры неабходнасці дадаць цукар.

— Апошняе дазволіць зрабіць віно лячэбным. 60 грамаў цукру на літр соку — дакладная лічба. І потым — корак у ёмістасць, трубачку ў ваду. Галоўнае — не ставіць на сонца, побач з ацяпляльнымі прыборамі... Тэмпература павінна быць не ніжэй за +18, не вышэй за +20 градусаў. Наконт часу — усё індывідуальна: месяц або, можа, паўгоддзе спатрэбіцца. На смак трэба перыядычна каштаваць, — дае інструкцыю.

Ён частаваў сваім віном канадцаў, іншых замежнікаў, дык тыя спачатку не верылі, што зроблена яно з вінаграду поўначы Беларусі.

Чача вінаградная робіцца з адходаў, у прынцыпе, як звычайная бражка. Да адціснутай ягады дадаецца цукар і выганяецца самагонка. Яшчэ адзін напой ад Кухарава — гарбата з верхніх лістоў вінаграду, вельмі карысна і смачна.

Сёлета з-за зваротных замаразкаў у Францыі і ў некаторых іншых краінах на поўдні Еўропы страчана значная частка «сонечнага» ўраджаю. Беларускія вопытныя вінаградары змаглі выратаваць свае лозы. Яны могуць падзяліцца сваімі метадамі!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Спяваюць усе!

# КАЛІ ФАЛЬКЛОР — СПРАВА СЯМЕЙНАЯ



**На тэлеканале «Беларусь 3» запускаецца чарговы адметны тэлепраект. Аднак можна сказаць, што ён нават унікальны. «Хата на хату» — гэта першае ў Беларусі фальклорнае шоу. Дружныя музычныя сем'і, дзе песеннае майстэрства — справа сямейная, паспаборнічаюць паміж сабой і вынесуць на суд гледачоў самыя яскравыя праявы народнай культуры розных рэгіёнаў. Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з адным з вядучых праграмы «Хата на хату», этнакультуролагам і даўнім аўтарам нашай газеты Янкам Круком, каб даведацца пра ўсе сакрэты стварэння такога адметнага шоу.**

***— Іван Іванавіч, тым, хто яшчэ не паспеў паглядзець «Хату на хату», раскажыце, чым яна парадуе гледачоў?***

— Калі на тэлеканале «Беларусь 3» мне прапанавалі весці такі праект, я адразу пагадзіўся, бо там, дзе справа датычыцца фальклору, я заўсёды «за»! Намі будзе зроблена 10 фільмаў па 52 хвіліны кожны. У цэнтры ўвагі — адна-дзве сям'і, з розных абласцей. Мы, умоўна, выбіраем найбольш таленавітыя і найбольш прадстаўнічыя сем'і. Пры гэтым улічваецца адразу некалькі складнікаў. З аднаго боку, уменне спяваць, вялікі рэпертуар і рэальны вопыт спявання сям'ёй. У ідэале спяваюць чатыры пакаленні — бацька, маці, дзеці і ўнукі. Гэтым мы хочам падкрэсліць наяўнасць пераемнасці. З другога боку, гэта фальклорнае шоу, у аснову якога пакладзена народная культура. Усё круціцца вакол песні — абрадавай, пазаабрадавай, пра каханне, лірычнай, больш сучаснай. Часам мастацкі песенны спектр яшчэ больш шырокі.

***— На што найперш звяртаеце ўвагу падчас здымак?***

— Найбольш важнае выканальніцкае майстэрства ўсёй сям'і: бацькоў, дзяцей, унукаў. Дарэчы, часам здараецца так, што старэйшае пакаленне, следам за маладым, паступае ва Універсітэт культуры, навучаецца завочна, каб атрымаць дыплом, бо працягвае выкладаць у музычнай школе.

Цікава было ўбачыць у адным з рэгіёнаў сямейны ансамбль «Чароўныя музыкі», які складаецца з некалькіх сямейных пар суседзяў. Яны непадзельныя, свайго роду адзінае цэлае. У той перадачы можна пачуць і баян, і цымбалы, і скрыпку, убачыць, як 12-гадовыя дзеці займаюцца вышываннем, а 10-гадовая дзяўчынка, акрамя таго, што разам з маці сядзіць за інструментам, яшчэ і малюе. Такія адораныя героі!

Нас цікавіць і радавод сям'і. Просім герояў расказаць пра свае карані. Часта хтосьці кажа, што песня «Калінка» была любімай у дзеда, а яшчэ нейкая мелодыя вельмі падабалася бабулі — усё гэта і стала сямейнай спадчынай.

Дарэчы, звяртаем увагу і на падворкі. Звычайна сям'я паспявае не толькі спяваць, ездзіць на розныя замежныя конкурсы, атрымліваць там дыпломы пераможцаў, але і займацца гаспадаркай. Хтосьці трымае курэй, гусей, качак, іншыя да таго ж вырошчваюць цудоўныя кветкі — фрагменты пра гаспадарку таксама абавязкова ўваходзяць у перадачу.

***— Пэўна, цікава назіраць, як фальклорная творчасць перадаецца маладому пакаленню?***

— Сапраўды, мы назіраем, як духоўнае багацце сям'і пераходзіць да малодшых. Першы фільм акурат быў прысвечаны сям'і з пасёлка Маладзёжнага Лідскага раёна: там цікава было ўбачыць гадавалага хлопчыка, які хадзіць яшчэ не ўмеў, але ўжо цягаў за сабой бубен і пастаянна ў яго стукаў. Усе смяяліся і казалі, што гэта будучы народны артыст Беларусі.

Гаворачы пра мастацкую творчасць, песенны талент, мы імкнёмся паказаць старую беларускую песню, абрадавую. Гэта можа быць звязана з календаром: калядная, жніўная, траецкая, велікодная, купальская — ці быць прысвечаным вяселлю, калі сустракаюць, выпраўляюць маладых.

***— Ці мяняецца фальклор з цягам часу?***

— Час ідзе, безумоўна, змяняюцца і песні. Мы заўважаем, што ў рэпертуары з'яўляюцца любоўныя песні — сучасныя, жорсткія гарадскія рамансы і іншае.

Жорсткі гарадскі раманс — гэта песні пра няўдалае каханне, чым было вельмі перапоўнена жыццё нашых людзей у вёсцы, але найперш у горадзе ў 20-я гады XX стагоддзя. Тады пачыналіся міграцыі. Людзі, якія жылі ў вёсцы, раптам пачыналі ад'язджаць у горад, заставаліся там жыць. Адсюль і матывы пра мілага, які з'ехаў у горад і не вярнуўся... З аднаго боку, гэта «гарадскія» рамансы, па месцы дзеяння, а з другога, яны «жорсткія» — праз неразддзеленае каханне.

***— Разам з вамі ў кадры працуе Ларыса Мятлеўская, вядомая беларуская кулінарка...***

— Сапраўды, гэту перадачу мы вядзём з Ларысай Мятлеўскай — аўтаркай цыкла перадач пра беларускую кухню. Таму яна не адмятае яшчэ адзін важны складнік нашых сустрэч — тое, як накрыты стол і якія стравы прыгатаваны. Часцей за ўсё ежа ўнікальная або характэрная для гэтага рэгіёна. Безумоўна, людзі стараюцца, хочуць паказаць сябе з найлепшых бакоў, накрываючы стол, і мы паказваем яшчэ і такі іх талент.

Вялікую ўвагу ўдзяляем і ўменню самім падрыхтаваць свае касцюмы. Дзесьці яны аўтэнтычныя, звязаныя непасрэдна з тым рэгіёнам, у якім пражывае сям'я. Дзесьці выраблены паводле матываў спрадвечных строяў — вобразы тыя ж, але тканіна, натуральна, не выробленая з лёну сваімі рукамі, а набытая ў краме. Цікава распавядаць пра стварэнне такіх сцэнічных касцюмаў.

Мая жонка Аксана Катовіч таксама прымае самы актыўны ўдзел — заўсёды ездзіць з намі і з'яўляецца другім рэжысёрам. Яна параіла ў кожным выпуску рабіць адно-два ўключэнні з гісторыяй традыцыйнай культуры — звесткі бяром з нашай кнігі «Культура родавай памяці».

***— Крытэрый адбору герояў для перадачы досыць высокі. Каб сямейнае спеўнае майстэрства было аж у чатырох пакаленнях! Каб стол аўтэнтычнымі стравамі накрывалі. Наколькі складана было адшукаць такія сем'і?***

— Каб знайсці герояў, мы папрасілі дапамогі ў рэгіёнах. І нам літаральна адразу знайшлі герояў. Я глыбока перакананы, што гэты праект будзе доўжыцца яшчэ не адзін сезон. І калі мы здымем 10 фільмаў, пра іх пойдзе добры водгук, то, верагодна, будзе знята яшчэ 10 стужак. Пра такія сем'і мала гаворыцца як на тэлебачанні, так і ў перыядычным друку. Часцей кажуць пра суперзорак... Але насамрэч зоркі нараджаюцца з мясцовага фальклору і традыцый. Мы чамусьці прывыклі ўспрымаць народную творчасць як абязлічаную. Быццам бы няма чалавека-носьбіта, а носьбітам з'яўляецца народ. Але ж песню спявае канкрэтная таленавітая асоба. Таму мы і вырашылі паказаць партрэт таленавітых сем'яў, праз прызму песень, традыцыйнай культуры, памяці і таго, як гэта эстафета будзе перадавацца ў будучым.

***— Ці свабодна героі адчуваюць сябе перад тэлекамерамі? Гэта ж непрафесійныя артысты...***

